**Алімпіядныя заданні па беларускай мове і літаратуры для вучняў 9–11-х класаў**

*Прапанаваныя заданні прызначаны для падрыхтоўкі вучняў да розных этапаў рэспубліканскай алімпіяды па прадметах “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура” на III ступені навучання. Лінгвістычныя і літаратуразнаўчыя задачы праблемна-пошукавага характару спрыяюць развіццю мыслення, а займальныя заданні служаць сродкам фарміравання пазнавальнай цікавасці адораных і высокаматываваных вучняў.*

*Ірына ЦІМОХАВА,*
*настаўнік беларускай мовы і літаратуры*
*ДУА “Гімназія г. Быхава”,*
*Магілёўская вобласць*

**Заданне 1.** Зрабіце транскрыпцыю слоў.

| | |
|---|---|
| з кімсьці | |
| не змог | |
| з песняй | |
| скінуць | |
| ён і яна | |

**Заданне 2.** Устаўце прапушчаныя літары.

| | | | |
|---|---|---|---|
| рады…вышка | | кр…вацячэнне | |
| агн…стрэльны | | шкл…вырабы | |
| Люкс..мбург | | р…дкалессе | |
| рады…лагічны | | Гр…нландыя | |
| ц…мнавалосы | | выс…каякасны | |

**Заданне 3.** Запішыце фразеалагізмы, у якіх прысутнічае кампанент, што называе **частку цела** чалавека.

| № | Фразеалагізм | Кампанент | Значэнне фразеалагізма |
|---|---|---|---|
| 1. | Класці … на калоду | | “браць на сябе адказнасць за што-небудзь” |
| 2. | Праглынуць … | | “перастаць гаварыць, змоўкнуць” |
| 3. | Плячысты на … | | “прагны да яды, пражэрлівы” |
| 4. | Браць на … | | “фізічна перанапружвацца” |
| 5. | Прамачыць … | | “выпіць трохі спіртнога” |
| 6. | Цяжкі на … | | “жорсткі, дэспатычны, моцна б’е” |
| 7. | Прадаваць … | | “весела смяяцца, рагатаць без прычыны” |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 8. | Набіваць … | | “выпрацоўваць навык, рабіцца спрактыкаваным у чым-небудзь” |
| 9. | Касы сажань у … | | “рослы, плячысты, магутнага складу мужчына” |
| 10. | Краем … | | “слухаць каго-небудзь няўважліва, урыўкамі” |

**Заданне 4.** Укажыце марфемны састаў прапанаваных слоў.

| Слова | Прыстаўка | Корань | Суфікс | Канчатак | Постфікс |
|---|---|---|---|---|---|
| спачатку | | | | | |
| здавалася | | | | | |
| прылёт | | | | | |
| здзіўляцца | | | | | |
| звычкі | | | | | |

**Заданне 5.** У старажытныя часы мерай вагі і даўжыні служыў чалавек, г.зн. *вага* – колькі ён зможа падняць на плечы, *даўжсыня* – на якую адлегласць працягвае руку. Вызначце, як раней называліся меры даўжыні і вагі, якія складалі:

| | Меры даўжыні | Адказ |
|---|---|---|
| 1 | Мера даўжыні, якая складае 71,12 см | |
| 2 | Мера даўжыні, роўная 1,06 км | |
| 3 | Мера даўжыні, роўная 2,134 м | |
| 4 | Мера даўжыні, роўная адлегласці паміж канцамі расцягнутых вялікага і ўказальнага пальцаў. | |
| 5 | Мера даўжыні, роўная 4,4 см | |

| | Меры вагі | Адказ |
|---|---|---|
| 1 | Мера вагі, роўная 409,5 г | |
| 2 | Мера масы, роўная 4,26 г | |
| 3 | Мера вагі, роўная 16,3 кг | |
| 4 | Мера масы, роўная 44 мг | |
| 5 | Старая мера вагі, роўная 164 кг | |

*Для даведак:* беркавец, пядзя, доля, вяршок, пуд, сажань, залатнік, аршын, фунт, вярста.

**Заданне 6.** Вызначце ў прапанаваных сказах граматычныя асновы і ахарактарызуйце іх (двухсастаўны – аднасастаўны (від аднасастаўнага).

| Сказ | Граматычная аснова | Характарыстыка сказа |
|---|---|---|
| 1. Маці папрасіла аднаго з хлопцаў паклікаць бацьку. | | |
| 2. Аднекуль дыхнула халодным ветрам. | | |
| 3. Дзень быў сонечны. | | |
| 4. Магутнае дрэва дуб. | | |

| | | |
|---|---|---|
| 5. Галоўныя члены сказа могуць аддзяляць адзін ад другога даданыя члены сказа. | | |

**Заданне 7.** Запішыце прапанаваныя лічэбнікі ў форме творнага склону і ўтварыце ад іх парадкавыя.

| Колькасны лічэбнік | У форме творнага склону | Парадкавы лічэбнік у пачатковай форме |
|---|---|---|
| семдзесят | | |
| трыста | | |
| дваццаць пяць | | |
| сто | | |
| адзін | | |

**Заданне 8**. Запоўніце пустыя клеткі ў табліцы “Беларускія народныя святы”.

**Беларускія народныя святы**

| Дата свята | Падрыхтоўка да свята | Назва свята |
|---|---|---|
| 22 сакавіка | Гэты дзень лічыўся нараджэннем новага года, пачаткам абуджэння зямлі ад зімовага сну. З гэтага дня пачыналі адлічваць яшчэ 40 дзён, адмечаных маразамі па начах, па заканчэнні якіх можна было пачынаць сеяць – адну з самых важных сельскагаспадарчых спраў на ўвесь год. | |
| з 6 снежня па 19 студзеня | Па сяле хадзілі юнакі і дзяўчаты, пераапранутыя ў цыганоў, казу, жорава, кабылу. Спявалі песні, скакалі пад скрыпачку і бубен, у заключэнне выконвалі велічальную песню гаспадарам дома з самымі шчодрымі пажаданнямі, а ў адказ атрымлівалі пачастункі. | |
| Святкуецца гэтае свята на сёмым і восьмым тыдні пасля Вялікадня | Маладыя дзяўчаты з песнямі хадзілі ў лес. Абіралі там маладыя бярозкі і завівалі паміж сабой стужачкамі, каб атрымаліся такія ўпрыгожаныя вароцікі. | |
| Адзначаецца праз тыдзень пасля Вялікадня, заўжды ў аўторак | Дзень памінання памерлых ва ўсходніх славян, на які са старажытных часоў адбываліся трапезы на магілах бацькоў і блізкіх сваякоў. | |
| з 6 на 7 ліпеня | Прысвечана сонцу і росквіту зямлі. У народзе верылі, што ў гэту ноч рэкі свецяцца асаблівым нерэальным святлом, а ў іх водах купаюцца душы памерлых у абліччы русалак. | |

**Заданне 9.** Устанавіце, колькі год з дня нараджэння ўказаных пісьменнікаў-юбіляраў адзначаецца ў 2024 г.

| | |
|---|---|
| А) Іван Навуменка<br>Б) Рыгор Барадулін<br>В) Аляксей Пысін<br>Г) Аляксей Дудараў<br>Д) Леанід Дайнека | 1) 75 год з дня нараджэння<br>2) 80 год з дня нараджэння<br>3) 85 год з дня нараджэння<br>4) 90 год з дня нараджэння<br>5) 100 год з дня нараджэння<br>6) 105 год з дня нараджэння |

Адказ: А…, Б…, В…, Г…, Д….

**Заданне 10**

У 1959 годзе была заснавана Літаратурная прэмія імя Янкі Купалы, якая прысуджаецца за лепшыя творы паэзіі і драматургіі. Хто з названых беларускіх аўтараў быў узнагароджаны гэтай прэміяй за названыя ў табліцы творы. Запоўніце табліцу.

*Літаратары:* Кандрат Крапіва, Уладзімір Дубоўка, Максім Танк, Аляксей Пысін, Ніл Гілевіч, Леанід Дайнека, Рыгор Барадулін, Анатоль Вялюгін, Пімен Панчанка, Андрэй Макаёнак.

| № | Лаўрэат прэміі | Творы, за якія атрымана ўзнагарода |
|---|---|---|
| 1 | | паэма “Патрыятычная песня” |
| 2 | | камедыя “Лявоніха на арбіце” |
| 3 | | кніга паэзіі “Твае далоні” |
| 4 | | зборнік вершаў “Рум” |
| 5 | | кніга паэзіі “Палеская рапсодыя” |

**Адказы**

Заданне 1. Зрабіце транскрыпцыю слоў.

| | |
|---|---|
| з кімсьці | [с ^ к’ і м с’ ц’ і] |
| не змог | [н’ а ^ з м о х] |
| з песняй | [с’ ^ п’ э с’ н’ а й] |
| скінуць | [с к’ і н у ц’] |
| ён і яна | [й о н ^ ы ^ й а н а] |

Заданне 2. Устаўце прапушчаныя літары

| | | | |
|---|---|---|---|
| рады…вышка | ё | кр…вацячэнне | о |
| агн…стрэльны | я | шкл…вырабы | а |
| Люкс..мбург | е | р…дкалессе | э |
| рады…лагічны | я | Гр…нландыя | э |
| ц…мнавалосы | ё | выс…каякасны | а |

Заданне 3. Запішыце фразеалагізмы, у якіх прысутнічае кампанент, які называе частку цела чалавека.

| № | Фразеалагізм | Кампанент | Значэнне фразеалагізма |
|---|---|---|---|
| 1. | Класці … на калоду | галаву | “браць на сябе адказнасць за што-небудзь” |
| 2. | Праглынуць … | язык | “перастаць гаварыць, змоўкнуць” |
| 3. | Плячысты на … | пуза (жывот) | “прагны да яды, пражэрлівы” |
| 4. | Браць на … | пуп | “фізічна перанапружвацца” |
| 5. | Прамачыць … | горла | “выпіць трохі спіртнога” |
| 6. | Цяжкі на … | руку | “жорсткі, дэспатычны, моцна б’е” |
| 7. | Прадаваць … | зубы | “весела смяяцца, рагатаць без прычыны” |
| 8. | Набіваць … | руку | “выпрацоўваць навык, рабіцца спрактыкаваным у чым-небудзь” |
| 9. | Касы сажань у … | плячах | “рослы, плячысты, магутнага складу мужчына” |
| 10. | Краем … | вуха | “слухаць каго-небудзь няўважліва, урыўкамі” |

Заданне 4. Укажыце марфемны састаў прапанаваных слоў.

| Слова | Прыстаўка | Корань | Суфікс | Канчатак | Постфікс |
|---|---|---|---|---|---|
| спачатку | с- | -пача- | -т-, -к-, -у- | – | – |
| здавалася | з- | -да- | -ва-, -л- | -а- | -ся |
| прылёт | пры- | -лёт- | Ø | □ | – |
| здзіўляцца | з- | -дзіўл- | -я-, -ц- | – | -ца |
| звычкі | з- | -выч- | -к- | -і | – |

Заданне 5

| | Меры даўжыні | Адказ |
|---|---|---|
| 1 | Мера даўжыні, якая складае 71,12 см | аршын |
| 2 | Мера даўжыні, роўная 1,06 км | вярста |
| 3 | Мера даўжыні, роўная 2,134 м | сажань |
| 4 | Мера даўжыні, роўная адлегласці паміж канцамі расцягнутых вялікага і ўказальнага пальцаў. | пядзя |
| 5 | Мера даўжыні, роўная 4,4 см | вяршок |

| | Меры вагі | Адказ |
|---|---|---|
| 1 | Мера вагі, роўная 409,5 г | фунт |
| 2 | Мера масы, роўная 4,26 г | залатнік |
| 3 | Мера вагі, роўная 16,3 кг | пуд |
| 4 | Мера масы, роўная 44 мг | доля |
| 5 | Старая мера вагі, роўная 164 кг | беркавец |

Заданне 6. Вызначце ў прапанаваных сказах граматычныя асновы і ахарактарызуйце іх (двухсастаўны – аднасастаўны (від аднасастаўнага).

| Сказ | Граматычная асноpremium | Характарыстыка сказа |
|---|---|---|
| 1. Маці папрасіла аднаго з хлопцаў паклікаць бацьку. | маці папрасіла | Двухсастаўны |
| 2. Аднекуль дыхнула халодным ветрам. | дыхнула | Аднасастаўны, безасабовы |
| 3. Дзень быў сонечны. | дзень быў сонечны | Двухсастаўны |
| 4. Магутнае дрэва дуб. | дуб дрэва | Двухсастаўны |
| 5. Дадаyныя члены сказа могуць аддзяляць адзін ад другога галоўныя члены сказа. | дадаыя члены сказа могуць аддзяляць | Двухсастаўны |

Заданне 7. Запішыце прапанаваныя лічэбнікі ў форме творнага склону і ўтварыце ад іх парадкавыя.

| Колькасны лічэбнік | У форме творнага склону | Парадкавы лічэбнік у пачатковай форме |
|---|---|---|
| семдзесят | сямюдзесяццю | сямідзясяты |
| трыста | трымастамі | трохсоты |
| дваццаць пяць | дваццаццю пяццю | дваццаць пяты |
| сто | ста | соты |
| адзін | адным | першы |

Заданне 8. Запоўніце пустыя клеткі ў табліцы "Беларускія народныя святы"

**Беларускія народныя святы**

| Дата свята | Падрыхтоўка да свята | Назва свята |
|---|---|---|
| 22 сакавіка | Гэты дзень лічыўся нараджэннем новага года, пачаткам абуджэння зямлі ад зімовага сну. З гэтага дня пачыналі адлічваць яшчэ 40 дзён, адмечаных маразамі па начах, па заканчэнні якіх можна было пачынаць сеяць – адну з самых важных сельскагаспадарчых спраў на ўвесь год. | Саракі. |
| з 6 снежня па 19 студзеня | Па сяле хадзілі юнакі і дзяўчаты, пераапранутыя ў цыганоў, казу, жорава, кабылу. Спявалі песні, скакалі пад скрыпачку і бубен, у заключэнне выконвалі велічальную песню гаспадарам дома з самымі шчодрымі пажаданнямі, а ў адказ атрымлівалі пачастункі. | Каляды |
| Святкуецца гэтае свята на сёмым і восьмым тыдні пасля Вялікадня | Маладыя дзяўчаты з песнямі хадзілі ў лес. Абіралі там маладыя бярозкі і завівалі паміж сабой стужачкамі, каб атрымаліся такія ўпрыгожаныя вароцікі. | Зялёныя святкі або Сёмуха |

| | | |
|---|---|---|
| Адзначаецца праз тыдзень пасля Вялікадня, заўжды ў аўторак | Дзень памінання памерлых ва ўсходніх славян, на які са старажытных часоў адбываліся трапезы на магілах бацькоў і блізкіх сваякоў. | Радаўніца |
| з 6 на 7 ліпеня | Прысвечана сонцу і росквіту зямлі. У народзе верылі, што ў гэту ноч рэкі свецяцца асаблівым нерэальным святлом, а ў іх водах купаюцца душы памерлых у абліччы русалак. | Купалле |

Заданне 9
Адказ: А5, Б4, В6, Г1, Д3.

Заданне 10

| № | Лаўрэат прэміі | Творы, за якія атрымана ўзнагарода |
|---|---|---|
| 1 | Пімен Панчанка | Паэма “Патрыятычная песня” |
| 2 | Андрэй Макаёнак | Камедыя “Лявоніха на арбіце” |
| 3 | Аляксей Пысін | Кніга паэзіі “Твае далоні” |
| 4 | Рыгор Барадулін | Зборнік вершаў “Рум” |
| 5 | Уладзімір Дубоўка | Кніга паэзіі “Палеская рапсодыя” |